**Председательствующий.** Ответное слово на приветствие профессуры и студенчества имеет тов. Криницкий. (Аплодисменты).

**Крыніцкі.** Таварышы, мы са здавальненьнем і радасьцю выслухалі прадстаўнікоў прафэсуры і студэнцтва. Наш партыйны зьезд зьяўляецца ня толькі зьездам, на якім мы вядзём напружаную працу, але ў той-жа самы час зьяўляецца для нас вялікім сьвятам таму, што і рабочыя, і сяляне, а таксама прадстаўнікі працоўнай інтэлігэнцыі прыходзяць вітаць нас, гавораць аб нашых дасягненьнях. І тым больш выразна мы, партыя, падагулівала вынікі нашай працы. У гэтым сэнсе кожны зьезд зьяўляецца ў найбольшай меры сур'ёзнай праверкаю ўсёй нашай працы за апошні год.

Мы чулі тут прывітаньні прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Рабочая кляса, камуністычная партыя заўжды лічыла, што інтэлігэнцыя гэта зусім ня ёсьць адно цэлае, і таму, калі мы чуем цяпер прывітаньні прадстаўнікоў інтэлігэнцыі, мы гаворым так: гэтыя прывітаньні сьведчаць аб тым, што значная большасьць навуковых працаўнікоў і студэнцтва добра зразумела, што толькі дыктатура пралетарыяту, пралетарская рэвалюцыя, толькі кіраўніцтва пралетарыяту з яго авангардам—камуністычнай партыяй забясьпечвае ўсяму чалавецтву выхад да новага ладу як эканамічнаму, так і культурнаму. Што толькі рабочая кляса і яе камуністычная партыя правільна вырашае надзвычайна складаныя пытаньні—нацыянальныя пытаньні.

І калі мы чуем тут прадстаўнікоў інтэлігэнцыі, мы гаворым: так, гэта ёсьць вельмі добрая адзнака таго, што ўсё большая частка інтэлігэнцыі падыходзіць на нашыя пралетарскія пазыцыі.

І мы лічым, што амаль уся інтэлігенцыя цяпер ня толькі на словах, а таксама на справе падтрымлівае камуністычную партыю, Савец-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

кую ўладу, хоча працаваць так, каб узмацніць справу дыктатуры пралетарыяту, справу будаўніцтва сацыялізму.

Мы таксама чулі тут, што вось гэтая найбольшая частка інтэлігэнцыі выступае супроць нацыянал-дэмакратычных настрояў, супроць нязначнай меншасьці інтэлігэнцыі, на што мы ўсё-ж такі ня можам зачыніць вачэй.

Таварышы падкрэсьлівалі, што яны ніколі ня будуць згаджацца з нацыянал-дэмакратычнай часткай інтэлігэнцыі. Добра! Мы таксама ведаем, што ёсьць нацыянал-дэмакратычныя дробна-буржуазныя настроі, што ёсьць адзінкі з гэткімі настроямі сярод інтэлігэнцыі, сярод навуковых працаўнікоў, сярод культурных працаўнікоў наогул. Але мы добра ведаем, што гэта толькі адзінкі, і мы з вялікім здавальненьнем чуем, што большасьць інтэлігэнцыі супроць гэтых адзінак, супроць гэтых настрояў.

І калі таварышы тут—перад зьездам камуністычнае партыі Беларусі гаварылі, што яны супроць нацыянал-дэмакратычных настрояў, супроць нацыянал-дэмакратычнай, няхай маленькай, часткі інтэлігэнцыі, мы шчыра хочам, каб гэта большасьць інтэлігэнцыі і беларуская, і яўрэйская, і расійская, ад імя якой выступалі таварышы, таксама вяла-б упартую барацьбу супроць іх і ў сваіх шэрагах, і на сваіх сходах, і ў сваёй штодзеннай працы. (Воплескі).

Трэба працаваць далей над тым, каб уся інтэлігэнцыя цалком, ня выключаючы і гэтай маленькай меншасьці, працавала-б пад кіраўніцтвам партыі над справай змацаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Тут таварышы гаварылі аб шчыльнай сувязі навукі, нашай працы і нашага будаўніцтва, якое вядзе рабочая кляса і камуністычная партыя. Уся наша партыя, УсеКП(б), Камінтэрн вядуць усю сваю працу на навуковым грунце. Нашае эканамічнае будаўніцтва па лініі прамысловасьці, па лініі сельскай гаспадаркі можа ісьці толькі пры бліжэйшым удзеле навуковых працаўнікоў БССР. Таксама наша культурнае будаўніцтва ў нашай краіне, адсталай у культурных адносінах, мы таксама зможам весьці толькі пры бліжэйшым удзеле, пры ўцягваньні ва ўсю гэту працу будаўніцтва навуковых працаўнікоў.

Калі мы будуем цяпер беларускую культуру, калі мы вядзём культурнае будаўніцтва на яўрэйскай, на польскай мове, калі мы будуем культуру, нацыянальную па форме, пралетарскую па зьместу, то трэба, каб ва ўсю гэту працу ўцягвалася інтэлігэнцыя ўсё ў большай меры.

Мы праводзім нацыянальную палітыку. Трэба, каб інтэлігэнцыя ўсё больш уцягвалася ў гэту працу. Мы са здавальненьнем выслухалі, што таварышы імкнуцца «высока трымаць сьцяг камуністычнай асьветы». Калі таварышы запэўніваюць зьезд, што яны жадаюць і будуць працаваць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы з вялікім здавальненьнем гэтае абяцаньне прымаем.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы